«асілак» звязваюць са стараслав. словам «осла», што азначае каменную прыладу, якой у старажытнасці выкрасалі агонь. Часам у фальклоры А. асацыіруецца з каменем, каменнымі жорнамі, громам, якія з'яўляюцца атрыбутамі бога навальніцы *Перуна*.

**АСІМЕ́ТРЫЯ** (ад грэч. asymmetria несуразмернасць), нелюстэркавае размяшчэнне частак пэўнага цэлага адносна восі, плоскасці або цэнтра. Адзін з прынцыпаў фарміравання кампазіцыі і будовы арнаменту, дзякуючы якому маст. твор набывае выразнасць. Выкарыстоўваецца ў будове твораў прасторавых і прасторава-часавых мастацтваў (архітэктуры, выяўл., дэкар.-прыкладнога, харэагр.), афармленні масавых святочных прадстаўленняў. Маст. твор, пабудаваны паводле прынцыпу А., стварае ўражанне парушэння раўнавагі, неўпарадкаванасці, няўстойлівасці, нетрываласці. Як прынцып кампазіцыйнай будовы атрымаў пашырэнне ў мастацтве мадэрну, абстракцыянізму, футурызму, дэканструктывізму і інш. стылявых кірункаў 20 — пач. 21 ст. У архітэктуры Беларусі актыўна прымяняецца з 1980-х гг. (жылы дом на перакрыжаванні вуліц Мінская і Пушкіна ў Бабруйску, архіт. В.Галушчанка, К.Кожыч).

*Ю.Ю.Захарына.*

**АСІМІЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. assimilatio прыпадабненне, зліццё, засваенне), працэс страты этнічнай групай сваёй першапачатковай культуры і засваення каштоўнасцей і стандартаў інш. групы, з якой кантактуюць. Працэс А. можа адбывацца спантанна або штучна, ён разглядаецца як вынік акультурацыі. Тэрмін «А.» пачаў выкарыстоўвацца ў канцы 19 ст. ў ЗША у значэнні «амерыканізацыя», а амер. грамадства разглядалася як вял. «лабараторыя», дзе розныя культ. традыцыі перамешваюцца, аб'ядноўваючыся ў адно цэлае. Тэрмін ужываўся таксама для абазначэння палітыкі дамінуючай нац. групы, накіраванай на штучнае падаўленне традыц. культуры меншасці. Даследаванне працэсаў А. актыўна працягваліся ў 2-й пал. 20 ст. Размяжоўвалася аднабаковая А. (культура меншасці цалкам выцясняецца дамінуючай культурай) і культ. змешванне (элементы падпарадкаванай і пануючай культур змешваюцца і ствараюць аснову новай культуры). Як істотны фактар разглядаецца ступень А.: поўная А. сустракаецца рэдка, звычайна фіксуецца некаторая ступень трансфармацыі традыц. культуры меншасці пад уплывам культуры дамінуючай групы, дастаткова значным выяўляецца зваротны ўплыў на дамінуючую культуру. Вылучаюцца кампаненты працэсу А.: замена старых культ. стэрэатыпаў; інкарпарацыя членаў падначаленай групы ў дамінуючую; рост ліку змешаных бракаў; фарміраванне ў членаў падначаленай групы новай сац. ідэнтычнасці. У цяперашні час дамінуе разуменне А. як складанага і шматграннага працэсу, розныя аспекты якога (расавыя, этнічныя, паліт., дэмаграфічныя, псіхал. і інш.) мэтазгодна разглядаць самастойна. А. бывае натуральнай, стыхійнай, што адбываецца ў выніку збегу аб'ектыўных акалічнасцей (шырокіх кантактаў суседніх народаў, міграцый, міжэтнічных шлюбаў і інш.), і прымусовай, гвалтоўнай — у выніку інкарпарацыі, страты суверэнітэту, каланізацыйнай палітыкі. У мінулым у працэсе А. мяняўся паліт. і культ. ландшафт цэлых кантынентаў, знікалі з гіст. карты краіны і народы, фарміраваліся новыя народы і цывілізацыі, што яскрава дэманструе эпоха Вял. перасялення народаў і гібель Рымскай імперыі. Рассяляючыся па тэр. Беларусі ў 1-м — пач. 2-га тыс., славяне паступова асімілявалі балцкае і фіна-угорскае насельніцтва. Яцвягі, дайнова, судова, дзяволтва, літва прымалі ўдзел у этнагенезе «беларусаў». А. балтаў, асобных груп рускіх, мазаўшан, татар і інш. працягвалася ва ўмовах ВКЛ. Магнацкія роды балцкага паходжання (Радзівілы, Гедзімінавічы) апынуліся пад уплывам



*Да арт. **Асіметрыя**. Жылы дом у Бабруйску.*

мясц. слав. культуры, прынялі старабел. мову і зліліся са слав. элітай. Звычайна А. папярэднічае акультурацыя. Люблінская унія 1569, Контррэфармацыя, замена ў афіц. ужытку старабел. мовы адкрывалі шырокі шлях для пранікнення польск. культуры і паланізацыі мясц. шляхты. У 19 ст. ва ўмовах расійска-польск. супрацьстаяння А. развівалася ў 2 кірунках — паланізацыі і русіфікацыі (паводле рас. даных, у 1860 беларусы складалі 68% нас. Смаленскай губ., у 1926 — менш за 2%). Асіміляцыйныя працэсы ў першую чаргу закранаюць перыферыйныя зоны этнічнай тэр., а таксама бел. дыяспару.

У мовазнаўстве — фанетычны працэс, які адбываецца паміж гукамі аднаго тыпу (галоснымі або зычнымі) і заключаецца ў поўным або частковым артыкуляцыйна-акустычным іх прыпадабненні. Адрозніваюць А. поўную (адзін гук цалкам прыпадабняецца да другога: «лётчык — лё[чч]ык», «зжаць — [жж]аць», «на рэчцы — на рэ[цц]ы»)» і няпоўную (адзін гук прыпадабняецца да другога толькі часткова, па адной або дзвюх прыметах, напр., па звонкасці: «касьба—ка[з'б']а», «просьба—про[з'б']а», па глухасці: «лыжка — лы[шк]а», па

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ



*Асінагарадоцкая Пакроўская царква.*

цвёрдасці: «астраханскі (ад «Астрахань») — астраха[нс]кі»; па мяккасці: «снег — [с'н']ег», «песня — пе[с'н']а» і інш.).

*Літ.:* К р ы в і ц к і А.А., П а д л у ж н ы А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984; Фанетыка слова ў беларускай мове. Мінск, 1983; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1989.

*В.Р.Языковіч, В.С.Цітоў; Дз.В.Дзятко* (мовазнаўства).

**АСІНАГАРАДО́ЦКАЯ ПАКРО́ЎСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Асінагарадок Пастаўскага р-на. Пабудавана ў 1856 з дрэва на месцы папярэдняга храма. Да асн. прамавугольнага ў плане аб'ёму, накрытага шмат'ярусным дахам з высокай шатровай вежачкай у завяршэнні, прымыкаюць шырокі бабінец і 5-гранная апсіда з бакавымі рызніцай і ахвярнікам. Сцены вертыкальна ашаля-

са складаным па кампазіцыі завяршэннем. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

**АСІНА́ЎКА**, а с о ў к а, выдзеўбаная са ствала асіны *лодка*.

*Вежа-званіца каля Асінагарадоцкай Пакроўскай царквы.*



**АСІНАЎШЧЫ́ЗНА 2**, вёска ў Смаргонскім р-не. За 4 км на ПнЗ ад г. Смаргонь, 7 км ад чыг. ст. Смаргонь на лініі Маладзечна—Вільнюс, 246 км ад Гродна, на аўтадарозе Смаргонь—Вільнюс. Цэнтр Каранёўскага с/с. 185 гаспадарак, 551 ж. (2009).

У пач. 20 ст. ў Смаргонскай воласці Ашмянскага павета Віленскай губ. У 1905 — 84 ж. У 2004 — 138 гаспадарак, 392 ж.

У 2009 вучэбна-пед. комплекс дзіцячы сад—сярэдняя школа, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання насельніцтва, комплексны прыёмны пункт, кафетэрый, магазін.

**АСІНТО́РФ**, пасёлак у Дубровенскім р-не. За 16 км на Пн ад г. Дуброўна, 7 км ад чыг. ст. Асінаўка на лініі Орша—Смаленск, 88 км ад Віцебска. Цэнтр Асінторфскага с/с. 490 гаспадарак, 883 ж. (2009).

Узнік у 1927 у сувязі з будаўніцтвам торфапрадпрыемства. З 27.9.1938 рабочы пасёлак Аршанскага р-на Віцебскай вобл. У Вял. Айч. вайну з сярэдзіны ліп. да 23.6.1944 А. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. З 1946 у Арэхаўскім, з 1956 у Аршанскім, з 1965 у Дубровенскім р-нах. У 1969 — 3,3 тыс. ж. У 1991 — 639 гаспадарак, 1,8 тыс. ж., 2 школы (з іх 1 муз.), бальніца, 5 магазінаў. У 1999 1,3 тыс. ж. У 2004 пераўтвораны ў паселішча сельскага тыпу (пасёлак). У 2007 — 950 ж.

У 2009 дзіцячы сад-яслі, муз. і сярэдняя школы, клуб, б-ка, урачэбная амбулаторыя, Дом сястрынскага догляду, аптэка, аддз. сувязі і «Беларусбанка», аўтаматычная тэлефонная станцыя, кафэ, 4 магазіны; Пакроўская царква (1999). Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, помнік сав. воінам, партызанам, падпольшчыкам і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**АСІ́ПАВІЧЫ**, вёска ў Вілейскім р-не.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ